Біблія для дзяцей

прадстаўляе

# Нараджэнне Ісуса



Аўтар: Edward Hughes
Ілюстратар: M. Maillot
Адаптаваў: E. Frischbutter; Sarah S.
Пераклаў: Christian Lingua
Выдавец: Bible for Children
www.M1914.org

BFC
PO Box 3
Winnipeg, MB R3C 2G1
Canada

©2018 Bible for Children, Inc.
Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).

Вельмі даўно, Бог паслаў анёла Гаўрыіла да прыгожай маладой габрэйскай дзяўчыны з імем Марыя. Ён сказаў ёй: "У цябе будзе сын і ты дасі Яму імя: Ісус. Ён будзе называцца Сынам Усявышняга. Ён будзе вечна кіраваць светам".



“Як гэта можа быць?” – запытала дужа ўражаная дзяўчына, – “я яшчэ не была ні з адным мужчынам”.  Анёл сказаў Марыі, што дзіця з’явіцца ад Бога. Зямны бацька не будзе ў гэтым удзельнічаць.



Затым анёл сказаў Марыі, што яе сваячка Елізавета хутка народзіць дзіця, нягледзячы на старасць.  Гэта таксама быў цуд.  Неўзабаве Марыя наведала Елізавету. Яны разам праславілі Бога.



Марыя была заручаная з мужчынам па імені Іосіф. Іосіфу стала сумна, калі ён даведаўся, што Марыя чакае дзіця. Ён падумаў, што нейкі іншы мужчына быў бацькам.



Анёл Божы ў сне сказаў Іосіфу, што гэтае дзіця было Сынам Божым.  Іосіф павінен быў дапамагчы Марыі даглядаць за Ісусам.



Іосіф паверыў Богу і паслухаўся Яго. Ён таксама падпарадкоўваўся законам сваёй краіны. У той час быў выдадзены новы закон, згодна якому Іосіф і Марыя павінны былі пайсці ў свой родны горад, Віфлеем, каб заплаціць



падаткі.



Марыя ўжо была гатовая нарадзіць дзіця. Але Іосіф нідзе не мог знайсці вольны пакой. Усе гатэлі былі перапоўненыя.

Нарэшце, Іосіф знайшоў хлеў. Там, немаўлятка Ісус і нарадзіўся. Ягоная маці паклала яго ў яслі, месца, дзе звычайна ставілі ежу для жывёлін.



Непадалёк пастухі ахоўвалі свае статкі авечак.
Анёл Божы з’явіўся і сказаў ім радасную навіну.
“бо сёння нарадзіўся вам у горадзе
Давідавым Збаўца,
Які ёсць
Хрыстос
Гасподзь.

Вы знойдзеце
Дзіця, Яно
ляжыць у
яслях”.



Раптам з’явілася мноства больш светлых анёлаў, якія ўслаўлялі Бога, кажучы: “слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля”.



Пастухі паспяшаліся да стайні.
Убачыўшы Дзіцятка, яны пачалі
распавядаць усім сустрэчным
тое, што анёлы казалі пра Ісуса.





Праз сорак дзён Іосіф і Марыя прынеслі Ісуса ў храм у Ерусаліме. Там чалавек па імені Сымон праславіў Бога за Дзіцятка, а старая Ганна, іншая слуга Госпада, таксама падзякавала Богу за Ісуса.



Абодва ведалі, што Ісус быў Сын Божы, абяцаны Збаўца. Іосіф ахвяраваў дзве птушкі.  Гэта ахвяра, якую, згодна з Божым законам, бедныя людзі павінны былі прынесці, калі яны прадстаўлялі нованароджанае дзіця перад Госпадам.

Праз некаторы час асаблівая зорка прывяла мудрацоў з усходняй



краіны ў Ерусалім. “Дзе Той, Хто нарадзіўся, Цар Юдэйскі?” – спыталі яны.  “Мы хочам пакланіцца Яму”.

Цар Ірад
пачуў пра мудрацоў.
Занепакоены, ён
папрасіў іх сказаць
яму, дзе знаходзіцца
Ісус, калі яны знойдуць
Яго. "Я таксама хачу
Яму пакланіцца" –
сказаў Ірад.
Але ён хлусіў.
Ірад хацеў
забіць
Ісуса.



Зорка прывяла мудрацоў да таго самага дому, дзе Марыя і Іосіф жылі з маленькім Дзіцём. Схіліўшыся ў пакланенні, вандроўнікі ўручылі Ісусу дарагія падарункі – золата і парфуму.







Бог папярэдзіў мудрацоў, каб яны вярталіся дадому таемна.  Ірад быў у лютасці.





Але Ірад не змог
пашкодзіць Сыну
Божаму!  У сне Іосіф
атрымаў папярэджанне і,
прачнуўшыся, узяў
Марыю і Ісуса,
каб адвесці іх
у бяспечнае
месца, у Егіпет.

Калі Ірад памёр,
Іосіф прывёў
Марыю і Ісуса
назад з Егіпта.



Яны жылі ў
маленькім горадзе Назарэце,
недалёка ад Галілейскага мора.

Нараджэнне Ісуса

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Мацьвея 1-2, Лукі 1-2

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Канец

Гэтая Біблейская гісторыя распавядае нам пра цудоўнага Бога, Які стварыў нас, і хоча, каб вы ведалі Яго.

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх ёсць смерць, але Бог любіць вас так моцна, што Ён паслаў Свайго адзінага Сына, Ісуса, памерці на крыжы і панесці пакаранне за вашыя грахі. Потым Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся дадому, на нябёсы! Калі вы паверыце ў Ісуса і папросіце Яго прабачыць вашыя грахі, Ён зробіць гэта! Ён прыйдзе і цяпер будзе жыць унутры вас, а вы будзеце жыць з Ім вечна.

Калі вы верыце, што гэта праўдзіва, скажыце Богу наступнае: Дарагі Ісус, я веру, што Ты Бог і стаў чалавекам, каб памерці за мае грахі, і цяпер Ты зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, і аднойчы прыйсці да Цябе, каб быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне слухацца Цябе і жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін.

Чытай Біблію і размаўляй з Богам кожны дзень! Ян 3:16